Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ЛЮТАГА 2015 г. ПЯТНІЦА № 33 (27891) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 КАНАЛАЎ



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**



**Як сустракаюць замежных спартсменаў**

СТАР. 4

# ЧУЖОГА НАМ НЕ ТРЭБА, СВАЙГО НЕ АДДАДЗІМ

**Мы ніколі не будзем увязвацца ў неразумныя супрацьстаянні, але здолеем абараніць суверэнітэт сваёй краіны**



**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора выступіў перад камандным складам Узброеных Сіл. У сваім выступленні кіраўнік дзяржавы закрануў важныя аспекты нацыянальнай бяспекі і развіцця беларускай арміі.**

### Пра сістэму міжнароднай бяспекі

«Такія арганізацыі, як ААН, АБСЕ, знаходзяцца пад відавочным уплывам адпаведных дзяржаў. І, калі прама казаць, ніякія функцыі па міжнароднай бяспецы яны ўжо не здольны ажыццяўляць. Яны дэманструюць няздольнасць эфектыўна падтрымліваць бяспеку ў свеце, вырашаць глабальныя праблемы і актуальныя задачы сучаснасці», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што Беларусь з-за свайго геаграфічнага становішча і адкрытасці ў поўнай меры зведвае ўздзеянне большасці геапалітычных працэсаў, што адбываюцца ў свеце. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ЗША і іх заходнееўрапейскія саюзнікі па-ранейшаму праводзяць планамерную дзейнасць па замацаванні сваіх лідзіруючых пазіцый у ваеннай, палітычнай і эканамічнай сферах.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

***«Мясцовыя органы ўлады, на жаль, не заўсёды адказна ставяцца да агучаных насельніцтвам праблемаў. Большасць з гэтых праблемных момантаў даўно былі знаёмыя кіраўнікам тых ці іншых ведамстваў. І тыя пытанні можна было вырашыць на мясцовым узроўні, не чакаючы, пакуль прыедзе вышэйшае кіраўніцтва, для гэтага мясцовыя органы ўлады валодаюць дастатковай кампетэнцыяй. Важна кожнаму чалавеку даць зразумець, што яго праблемай займаюцца адпаведныя арганізацыі. Калі ж разгляд пытання адкладаецца, то трэба патлумачыць, па якой прычыне гэта зроблена і калі да яго можна будзе звярнуцца зноў».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.02.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14770,00 | ▼ |
| Еўра | 16860,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 238,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 544,52 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Прыёмная кампанія — 2015




Фота Надзеі БУЖАН.

# ПА ПРАФЕСІЮ — НА ВЫСТАВУ

**120 удзельнікаў з 12 краін сабрала пад сваім дахам выстава «Адукацыя і кар'ера», якая адкрылася ўчора ў сценах Палаца мастацтваў у Мінску.**

— Для таго, каб упэўнена крочыць па жыццёвым шляху, вельмі важна зрабіць правільны прафесійны выбар, — падкрэсліў падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця выставы **намеснік старшыні Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Віталь ПРЫГОДЗІЧ.** — Больш за тое, сёння ва ўсім свеце актуальны лозунг «Адукацыя не на ўсё жыццё, а праз усё жыццё». Таму, спадзяюся, кожны, хто завітае ў гэтыя дні ў Палац мастацтваў, зможа знайсці тут для сябе карысную інфармацыю.

Па словах Віталя Прыгодзіча, за 13 гадоў свайго існавання выстава «Адукацыя і кар'ера» ператварылася ў своеасаблівы навігатар, які дапамагае моладзі зарыентавацца ў мностве прафесій і ў моры адукацыйных паслуг. Удзел у ёй бяруць вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы, установы паслядыпломнай і дадатковай адукацыі, арганізатары моўных курсаў, а таксама кампаніі, якія працуюць у сферы адукацыйнага турызму і адукацыі за мяжой.

У школьнікаў ёсць магчымасць паўдзельнічаць у бясплатным прафарыентацыйным экспрэс-тэсціраванні, даведацца ў спецыялістаў формулу і ўмовы паспяховага выбару прафесіі, на якую інфармацыю трэба звяртаць увагу ў першую чаргу пры вывучэнні рэйтынгаў вышэйшых навучальных устаноў і іх сайтаў. Акрамя таго, абітурыенты могуць асабіста пагутарыць з прадстаўнікамі прыёмных камісій.

У рамках выставы запланаваны прэзентацыя асобных прафесій, электроннага даведніка для абітурыентаў www.Kuda.Postupat.by, адзінага ў краіне прафарыентацыйнага часопіса для старшакласнікаў, педагогаў і бацькоў «Кім быць?»

Удзельнікі выставы плануюць правесці шырокі агляд адукацыйных праграм — ад школьных да паслядыпломных, уключаючы дактарантуру, дадатковае навучанне і адукацыю за мяжой. Прадстаўнікі кансультацыйных агенцтваў па адукацыйных праграмах за мяжой знаёмяць моладзь з умовамі навучання ў еўрапейскіх краінах.

Выпускнікі ВНУ, маладыя спецыялісты, якія плануюць атрыманне паслядыпломнай адукацыі або набыццё дадатковых кваліфікацый, могуць атрымаць кансультацыі прадстаўнікоў вучэбнага цэнтра IBA, Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ, Інстытута інфармацыйных тэхналогій БДУІР, Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ. Прадстаўнікі моўных школ раскажуць пра нюансы здачы міжнародных экзаменаў IELTS, TOEFL, DALF і TestDaF.

Выстава будзе працаваць па 21 лютага ўключна. Дарэчы, летась яе наведалі каля 10 тысяч чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Будзь у курсе!**

***21 лютага з 9.00 да 12.00 старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама праводзіць прамую тэлефонную лінію. Задаць пытанне можна па тэлефоне 380 31 52.***

# ЧУЖОГА НАМ НЕ ТРЭБА, СВАЙГО НЕ АДДАДЗІМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Войны ўжо не аб'яўляюцца, а пачаўшыся, ідуць не па звыклым шаблоне. Вопыт сучасных ваенных канфліктаў паказвае, што пасяховая дзяржава за лічаныя месяцы і нават дні можаператварыцца ў арэну бязлітаснага ўзброенага змагання, стаць ахвярай замежнай інтэрвенцыі, апусціцца ў вір хаосу, гуманітарнай катастрофы і грамадзянскай вайны»,— сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што разам з адкрытым ваенным уварваннем асаблівае месца ў інструментарыі ўладных людзей занялі «каляровыя» рэвалюцыі. «У іх аснове ляжыць глыбокая трансфармацыя свядомасці людзей. Па сутнасці, яе разбурэнне, падмена фундаментальных каштоўнасцяў іх сурагатамі і памылковымі ідэямі, сэнсамі»,— лічыць беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што супраць Беларусі прымяняюцца эканамічныя санкцыі і дыскрымінацыйныя захады палітычнага характару. На яго думку, гэтыя і іншыя знешнія фактары негатыўна ўплываюць на стан нацыянальнай бяспекі.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нават у такіх няпростых знешніх умовах Беларусь не адступіць ад рэалізацыі міралюбівай знешняй палітыкі, будзе і надалей абараняць свае інтарэсы.

«Вядома, мы хацелі б і ў далейшым абапірацца на моц брацкай Расіі пры натуральным уліку нашых інтарэсаў у сферы суверэнітэту і незалежнасці Беларусі»,— сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь таксама разглядае супрацоўніцтва ў рамках Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы як гарант бяспекі краіны і забеспячэння стабільнасці на Еўразійскім кантыненце.

Аднак, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, гэта не значыць, што Беларусь адмаўляецца ад дыялогу з іншымі краінамі і ваенна-палітычнымі арганізацыямі, у прыватнасці, НАТА, на прынцыпах парытэтнасці і празрыстасці.

## Пра сітуацыю ў Беларусі

«Мы, калі трэба, павінны ўмець абараніць незалежнасць, суверэнітэт нашай краіны, але ніколі не будзем увязвацца ў неразумныя, бязглуздыя супрацьстаянні з кім бы там ні было. Мы будзем праводзіць разумную, стрыманую палітыку: нам чужога не трэба, свайго нікому не аддадзім. Гэта сутнасць нашай палітыкі. І калі трэба за гэта памерці, мы будзем паміраць за гэта»,— сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ва ўмовах няпростага міжнароднага становішча і існуючых эканамічных цяжкасцей унутрыпалітычная сітуацыя ў Беларусі застаецца стабільнай. У той жа час, паводле яго слоў, гэта не значыць, што можна сабе дазволіць расслабіцца. «Ніхто не можа сёння думаць, што ўсё добра, што вось мы тут вялікія міратворцы, пасярэднікі, і за гэта нам хтосьці будзе плаціць і ў нас будзе мір і спакой надален. Не падманвайцеся. Яшчэ раз падкрэсліваю: ніхто нам спакойнага жыцця не гарантуе. Мы будзем рабіць усё, каб гэтае жыццё было спакойным, але мы павінны мець баяздольную армію, ды і ўсе Узброеныя Сілы»,— падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Беларусы — мірныя людзі. Невыпадкова пра гэта гаворыцца ў першым жа радку нашага Дзяржаўнага гімна. Аднак, гледзячы на падзеі, што адбываюцца ў краінах блізкага і далёкага замежжа, дарэчы ўзгадаць прапісную ісціну аб неабходнасці трымаць порах сухім»,— адзначыў Прэзідэнт.

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на стабільную работу эканомікі. «Любыя ўзрушэнні тут — гэта выклікі і пагрозы для нацыянальнай бяспекі,— адзначыў Прэзідэнт.— Будзе ў нас нармальна ў эканоміцы — ніякія ўзрушэнні нам не страшныя». Ён падкрэсліў, што ў краіне прыняты ўсе неабходныя рашэнні, у тым ліку кадравыя, каб эканоміка магла функцыянаваць.

«Як бы цяжка гэта нам ні давалася, Беларусь ні на ёту не адступіць ад выканання сваіх сацыяльных абавязацельстваў. Больш за тое, сёлета мы пачалі рэалізацыю шэрагу амбіцыйных праектаў, накіраваных на сацыяльную падтрымку сем'яў і забеспячэнне дэмаграфічнай бяспекі»,— дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што важныя грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі традыцыйна суправаджаюцца актывізацыяй спроб і «пятай калоны», і яе замежных апекуноў разладзіць грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне. «Мы гэта ўсё праходзілі. У нас ёсць дзейсныя інструменты адэкватнага рэагавання. Але выключна ў прававым полі. І ўсе павінны разумець: мы ні з кім гуляцца не будзем і ў нас не заржавее, калі камусьці захочацца якога-небудзь тут майдана або яшчэ чаго-небудзь горшага»,— адзначыў Прэзідэнт.

## Пра мадэрнізацыю арміі

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што цалкам падтрымаў прапановы міністра абароны аб напрамках мадэрнізацыі арміі, Узброеных Сіл, ваеннай тэхнікі, закупках новых узбраенняў. «Мы абавязкова знойдзем тыя сродкі, якія запрошвае Міністэрства абароны. І калі мы ажыццявім тое, што намецілі (а план да 2020 года) то мы да 2035–2040-х гадоў будзем мець добрую армію, на якую не трэба будзе траціць такія сродкі, якія мы трацім сёння»,— сказаў кіраўнік дзяржавы.

У няпростых сучасных умовах рэалізацыя мерапрыемстваў па далейшым павышэнні абараназдольнасці краіны набывае асаблівую значнасць. «Можна адзначыць, што дзейнасць у гэтай сферы Мінабароны ў цэлым заслугоўвае станоўчай ацэнкі»,— сказаў кіраўнік дзяржавы. «Нават нашы недабразычліўцы прызнаюць — беларуская армія застаецца адной з самых баяздольных у рэгіёне Усходняй Еўропы і Азіі. Тым не менш спачываць на лаўрах не трэба. Як паказала праведзеная летась праверка Узброеных Сіл, недахопаў у войсках яшчэ нямала. Адпаведныя рашэнні былі мной прыняты. Цяпер ідзе работа па нейтралізацыі гэтых недахопаў і робіцца ўсё, каб такога ў будучыні не было»,— падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Міністэрствам абароны падрыхтаваны важны дакумент ваеннага планавання дзяржавы — План абароны Беларусі. «Словам, зроблена нямала, зрухі пазітыўныя ёсць»,— рэзюмаваў Прэзідэнт, заявіўшы аб намеры ў далейшым праінспектаваць узровень фізічнай і баявой падрыхтоўкі афіцэраў Узброеных Сіл. Аляксандр Лукашэнка таксама запатрабаваў рэгулярна праводзіць заняткі і зборы з рэзервам войскаў тэрытарыяльнай абароны. Ваенная навука і адукацыя, на думку Прэзідэнта, неабходна засярodзіць намаганні на вызначэнні і практычным засваенні найбольш мэтазгодных і аптымальных метадаў падтрымання баявой гатоўнасці. А таксама прапрацоўцы і ўкараненні сучасных спосабаў вядзення ваенных дзеянняў, асабліва ва ўмовах гібрыдных войнаў.

Звяртаючыся да каманднага складу Узброеных Сіл, Прэзідэнт асабліва падкрэсліў яго адказнасць у працэсе ўдасканалення механізму забеспячэння ваеннай бяспекі. «Нам трэба і далей уважліва вывучаць варыянты сілавога рэагавання на сучасныя пагрозы. Вывучаючы вопыт барацьбы і канфліктаў, у тым ліку ўкраінскага, мы павінны бачыць, якая нам патрэбна армія, і неадкладна рэагаваць на такія рэчы»,— заявіў беларускі лідар.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што ўзровень сацыяльнай абароненасці ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў у Беларусі будзе захаваны, нягледзячы на існуючыя эканамічныя цяжкасці. Ён заўважыў, што па большасці пазіцый ваеннаслужачыя матэрыяльна забяспечваюцца не горш і нават лепш за іншых работнікаў бюджэтнай сферы.

На сустрэчы міністр абароны Андрэй Раўкоў падарыў кіраўніку дзяржавы аўтамат Калашнікава ў спецыяльным футарале. «Вы павінны ведаць: у неабдуманыя, непатрэбныя для краіны авантуры я вас ніколі не ўцягну. Але калі давядзецца абараняць сваю зямлю і стаяць плячо ў плячо, вы можаце быць упэўнены, што мяне вы там убачыце ў першых радах»,— падкрэсліў беларускі лідар.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Парламенцкі дзённік

# Быць пачутым праз сеціва

## Дэпутаты абмеркавалі, як разглядаць электронныя звароты

**Сёння больш за 40 працэнтаў афіцыйных зваротаў у дзяржаўныя структуры беларусы накіроўваюць праз інтэрнэт. Пра тое, як іх правільна падаваць, дэпутаты казалі на трэцім пасяджэнні працоўнай групы па разглядзе законапраекта «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян».**

«Законапраект ні ў якім разе не прадугледжвае адмену электроннай формы падачы зваротаў грамадзян. Хутчэй, прапаноўваецца ўпарадкаваць іх разгляд»,— патлумачыла **Аксана НЯХАЙЧЫК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.**

Згодна з сучасным заканадаўствам, звароты праз глабальную сетку можна адсылаць і па электроннай пошце, і праз спецыяльную рубрыку на сайтах дзяржаўных органаў. Але першы спосаб выклікае шмат праблем. «Здаралася так, што людзі рэгістраваліся пад неіснуючым адрасам. Ці, напрыклад, зварот накіроўваўся ад імя чалавека, які пра яго ніколі не чуў. І каму тады адсылаць адказ?»,— задае рытарычнае пытанне Аксана Няхайчык.

Для таго, каб такія праблемы ўзнікалі радзей, парламентарыі прапанавалі шэраг дапрацовак да законапраекта. На тыя звароты, што дасылаюцца праз спецыяльную рубрыку на сайтах дзяржаўных органаў, адказы павінны будуць з'яўляцца абавязкова. Там жа, на сайце, можна будзе пазнаёміцца больш падрабязна з кампетэнцыяй структуры і зразумець, ці па адрасе заяўнік просіць дапамогі. Звароты, якія прыходзяць на адрас электроннай пошты, разглядаюцца па рашэнні кіраўніка дзяржоргана.

Пра актуальнасць электронных зваротаў сведчыць тое, што падчас дапрацоўкі праекта закона да другога чытання ў парламент паступіла больш за 40 прапаноў, у тым ліку з дзвюх пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў, ад асобных дэпутатаў і грамадзян, прычым каля 30 працэнтаў з іх паступілі менавіта ад грамадзян.

Раней працоўная група па законапраекце абмеркавала паўторныя звароты грамадзян і асаблівасці правядзення асабістага прыёму.

Праект закона ў другім чытанні плануецца падрыхтаваць да вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■ Тры пытанні да ўлады



# З ПАВАГАЙ ДА СПАДЧЫНЫ

**Сёлета Шчучын прыме «эстафету» Дня беларускага пісьменства. Аб тым, як да яго рыхтуецца горад і раён, расказаў старшыня Шчучынскага райвыканкама Сяргей ЛОЖАЧНІК.**

**— Якія задумы ёсць у падрыхтоўцы да гэтага свята?**

— Па-першае, сам горад Шчучын павінен адпавядаць высокаму статусу сталіцы беларускага пісьменства. Распрацаваны цэлы шэраг мерапрыемстваў па правядзенні рамонтна-будаўнічых работ. Галоўная ўвага — установам сацыяльнай сферы. Мы плануем завяршыць грунтоўную рэканструкцыю бібліятэкі імя Цёткі, адрамантаваць раённы Дом культуры. Маюцца планы па капітальным рамонце гарадскога стадыёна «Алімп» і кінатэатра «Беларусь».

Праграма свята яшчэ дапрацоўваецца. Ужо ёсць некаторыя творчыя задумы, але мы раскрываць іх пакуль не будзем. Магу сцвярджаць, што шчучынцы пастараюцца здзівіць удзельнікаў і гасцей свята.

**— Ці ўдаецца аднаўляць гістарычныя аб'екты, якія захаваліся на тэрыторыі раёна?**

— Літаральна за некалькі апошніх гадоў адбыліся адчувальныя зрухі ў плане адраджэння архітэктурных помнікаў. У прыватнасці ажыццяўляліся рэстаўрацыйныя работы на тэрыторыі былой сядзібы Іваноўскіх у Галавічполі. Спадзяёмся, што да верасня сёлетняга года будзе скончана рэстаўрацыя аднаго з сімвалаў Шчучына — былога палаца князёў Друцкіх-Любецкіх.

Доўгі час заставаўся нявызначаным лёс былой рэзідэнцыі князёў Святаполк-Чацвярцінскіх у гарадскім пасёлку Жалудок, якая знаходзілася ў сумным стане. Але летась палацава-паркавы комплекс перайшоў да новых уладальнікаў — сям'і з Расіі. Цяперашнія гаспадары, набыўшы палац на аўкцыёне, плануюць ператварыць яго ў музейна-турыстычны комплекс, тым больш што яны ўжо маюць досвед у падобным бізнесе. Для раёна гэта не толькі новыя інвестыцыі, рабочыя месцы, але і выдатны прыклад выкарыстання маёмасці, утрыманне якой абцяжарвае бюджэт.

**— Шмат турыстаў з Беларусі і замежжа наведваюць вёску Старыя Васілішкі, дзе знаходзіцца музей музыканта Чэслава Немана. Ці ёсць планы па яго далейшай папулярызацыі?**

— Увесь 2014 год праходзіў для аматараў творчасці Чэслава Немана пад знакам юбілейнай даты — 75-годдзя з дня нараджэння творцы, якога лічаць самай яскравай польскай музычнай зоркай XX стагоддзя. З 2010 года ў сціплай драўлянай хаціне, дзе з'явіўся на свет Чэслаў, адкрыты клуб-музей. За час існавання гэтай установы яе наведалі каля 8 тысяч чалавек, а вёска Старыя Васілішкі ператваралася ў сапраўдную турыстычную Меку. Зразумела, што не выкарыстаць такі патэнцыял для нас будзе проста недаравальным. Таму мы вядзём актыўны пошук інвестараў для рэканструкцыі клуба-музея і ператварэння яго ў сучасны мультыпрофільны цэнтр, які зможа спалучыць і рысы традыцыйнага музея, і функцыі творчай майстэрні, і сучаснага турыстычнага аб'екта з разгалінаванай інфраструктурай. Як адзін з варыянтаў рэалізацыі дадзеных задум разглядаецца ўдзел у сумесным праекце па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва, тым больш што маецца зацікаўленасць партнёраў з Польшчы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Ведай нашых!

# РАДКІ І ЭФІРЫ ПАТРЫЯТЫЗМУ

**Па традыцыі напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл адбылася цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў і ўдзельнікаў штогадовага творчага конкурсу на лепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, патрыятычнага выхавання насельніцтва.**

Лаўрэатамі творчага конкурсу сталі і мы. Выдавецкі дом «Звязда» адзначаны дыпломам першай ступені ў намінацыі «Цеснае і плённае супрацоўніцтва» (за актыўны ўдзел творчага калектыву друкаванага СМІ ў асвятленні мерапрыемстваў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл, а таксама пытанняў патрыятычнага выхавання насельніцтва краіны). Спецыяльнаму карэспандэнту газеты Веранiцы Канюце *(на фота)* уручылі



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

дыплом першай ступені ў намінацыі «Аўтарскі погляд» (за цыкл публікацый у друкаваных СМІ пра жыццё і дзейнасць органаў ваеннага кіравання, злучэнняў і воінскіх часцей Узброеных Сіл, вайсковых навучальных устаноў і арганізацый Міністэрства абароны).

— Падвядзенне вынікаў конкурсу праходзіць у год 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне,— зазначыў **міністр абароны генерал-маёр Андрэй РАЎКОЎ.**— Менавіта таму ў тэматыцы нашага конкурсу прысутнічаюць два ўзаемазвязаных канцэптуальных паняцці: ваеннае будаўніцтва і патрыятычнае выхаванне.

Па словах **старшыні журы, памочніка міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальніка Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь генерал-маёра Аляксандра ГУРЫ,** гэтым разам для ўдзелу ў творчым конкурсе было пададзена 96 заявак ад СМІ Беларусі, што на 15% больш, чым у папярэдніх конкурсных перыядах. Прычым былі прадстаўлены ўсе рэгіёны краіны.

— Мы свята шануем традыцыі нашых бацькоў, будуем нашу суверэнную Беларусь, абапіраючыся на памяць аб мінулым і ствараючы мірны сённяшні дзень.— падкрэсліла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**— Сёння як ніколі запатрабавана сумленная і адказная журналістыка. Менавіта гэтыя крытэрыі з'яўляюцца асноватворнымі і галоўнымі пры асвятленні і такой важнай тэмы, як пытанні будаўніцтва Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і патрыятызму.

**Ніка МАЙСКАЯ**

■ Прыемная навіна

# Бюджэтнікам павялічваюць зарплату ў два этапы

**Такім чынам, тарыфная стаўка першага разраду павышаецца ў Беларусі ўжо ў лютым, а потым і ў сакавіку. Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў № 109 ад 18 лютага 2015 года.**

Цяпер для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі і работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый, тарыфная стаўка першага разраду вызначана з 1 лютага ў памеры 277 тысяч рублёў. А з 1 сакавіка яна павялічваецца да 292 тысяч рублёў. У выніку за два этапы тарыфная стаўка першага разраду падрасце прыкладна на 6%.

У рашэнні Саўміна ўдакладняецца, што рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый, неабходна забяспечыць пераразлік заработнай платы работнікаў у адпаведнасці з вызначанай Пастановай № 109 тарыфнай стаўкай першага разраду і каэфіцыентамі Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў Рэспублікі Беларусь з улікам карэктуючых каэфіцыентаў.

Прэс-служба Савета Міністраў адзначае, што павышэнне тарыфнай стаўкі дазволіць павялічыць заработную плату работнікам бюджэтнай сферы. Адначасова павялічацца памеры дзяржаўных стыпендый навучэнцам, даплат маладым спецыялістам, за вучоныя ступені, а таксама іншых выплат, якія залежаць ад памеру тарыфнай стаўкі першага разраду.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Надвор'е

# АТЛАНТЫКА НАСТУПАЕ

**Тэмпературны фон на выхадныя прагназуецца на 4–7 градусаў вышэйшы за кліматычную норму**



**Напрыканцы тыдня на тэрыторыю нашай краіны працягне паступаць цёплае паветра з Атлантыкі, таму ў бліжэйшыя дні тут усталюецца амаль веснавое надвор'е, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У пятніцу месцамі чакаюцца невялікія ападкі (мокры снег і дождж), у асобных раёнах туман і галалёдныя з'явы. Прагназуецца ўмераны заходні вецер. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да плюс 6 градусаў. І ў выхадныя характар надвор'я істотна не зменіцца. Месцамі будуць ісці мокры снег і дождж. Часам на працягу сутак туман і слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 0 да плюс 7 градусаў. Сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны фон прыкладна на 4–7 градусаў вышэйшы за кліматычную норму другой паловы лютага.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, і ў першай палове наступнага тыдня на тэрыторыі краіны захаваецца анамальная цеплыня. Пад уплывам атмасферных франтоў з боку паўднёвага захаду Еўропы паўсюдна па краіне будзе ісці дождж і зрэдку мокры снег. Тэмпература паветра ўначы да сярады складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень чакаецца ўвогуле 2–7 цяпла. Гэта яшчэ не сакавік, але рэпетыцыя вясны сур'ёзная.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Далучайся!

# У РОДНАЙ МОВЫ — СВЯТА

**Святкаванне Міжнароднага дня роднай мовы расцягнецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на цэлы тыдзень. Гэтай падзеі прысвечаны цыкл мерапрыемстваў, якія будуць арганізаваны на філалагічным факультэце БДУ.**

У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця сёння возьмуць удзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, прафесар, членкарэспандэнт НАН Беларусі Аляксандр Лукашанец і загадчык кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Вячаслаў Рагойша. Студэнты філфака падрыхтавалі літаратурна-музычную праграму «Ад Бога мова ў кожнага народа…» У іх выкананні прагучаць вершы вядомых беларускіх пісьменнікаў, а таксама вершы ўласнага складання.

Упершыню ў праграму тыдня (23 лютага) уключана экскурсія па Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэцы, дзе будзе прадстаўлена выстава «Радасць слова» (праспект Пераможцаў, 7, пакой 607). На наступны дзень пройдзе тэлемост Мінск — Віцебск. Удзельнікамі сустрэчы стануць выкладчыкі кафедры беларускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, супрацоўнікі філалагічнага факультэта БДУ, а таксама вядомы беларускі літаратуразнаўца, прафесар Адам Мальдзіс. Лінгвісты абмяркуюць перспектывы развіцця і функцыянавання беларускай мовы. Акрамя таго, у рамках відэадыскусіі адбудзецца прэзентацыя энцыклапедычнага даведніка «Сузор'е беларускага Памежжа», а таксама новых лінгвістычных лексікаграфічных выданняў.

А 26 лютага распачнецца Дзень беларускай філалогіі. Для студэнтаў будзе арганізавана сустрэча з загадчыкай кафедры класічнай філалогіі філалагічнага факультэта БДУ Галінай Шаўчэнкай і прафесарам кафедры гісторыі беларускай літаратуры Жаннай Некрашэвіч-Кароткай.

Заключным мерапрыемствам тыднёвай праграмы стане «круглы стол» на тэму «Пераклад у сістэме культурных сувязяў», які адбудзецца 27 лютага. Да дыскусіі далучацца студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта, а таксама паэт і перакладчык Андрэй Хадановіч.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

***Нагадаем, што Міжнародны дзень роднай мовы быў заснаваны рашэннем 30-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў лістападзе 1999 года і, пачынаючы з 2000 года, адзначаецца штогод 21 лютага.***

***Паводле звестак, якія прыводзіць Нацыянальны статыстычны камітэт Беларусі, ў 2014/2015 навучальным годзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на беларускай мове вывучалі ўсе прадметы больш за 135 тысяч навучэнцаў, а на рускай — каля 811 тысяч. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі на беларускай мове выхоўваюцца 43 тысячы дзяцей, а на рускай мове — амаль 368 тысяч. Ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі на беларускай мове навучаюцца 0,3 тысячы навучэнцаў, на рускай і беларускай мовах — каля 22 тысяч, на рускай мове — каля 107 тысяч.***

***Ва ўстановах вышэйшай адукацыі на беларускай мове навучаюцца толькі 300 студэнтаў, на рускай і беларускай мовах адначасова — больш як 149 тысяч і на рускай — каля 212 тысяч чалавек.***

■ На кантролі

# У ПРАКУРАТУРЫ ПАЦІКАВІЛІСЯ ТЭМПЕРАТУРАЙ



**Ці цёпла ў дзіцячых садках і школах, пацікавіліся пракурорскія работнікі. У рэйд разам з імі накіраваўся і карэспандэнт «Звязды».**

Калі ў вас у кватэры холадна, вы адразу тэлефануеце ў камунальную кантору і просіце разабрацца. Ці не так? Павінен прыйсці прадстаўнік ад ЖКГ з градуснікам, і калі тэмпература ніжэйшая за +18 градусаў, вы маеце права патрабаваць павысіць градус. Дык чаму ў дзіцячых садках і школах, дзе холадна, так не робяць? Не шкада дзяцей? Або іншых клопатаў хапае ў загадчыкаў і дырэктараў устаноў адукацыі? Гэтыя думкі самі сабой напрошваліся падчас таго рэйду.

Што здзівіла, дык гэта дэфіцыт градуснікаў. А гэтыя прыборы, аказваецца, павінны быць ва ўсіх пакоях, дзе знаходзяцца дзеці. Напрыклад, у віцебскім Дашкольным цэнтры развіцця дзіцяці № 4 у гульнявых памяшканнях груп № 6 і № 4 не было градуснікаў. А там жа знаходзяцца дзеці ва ўзросце ад 2 да 3 гадоў.

І ў віцебскіх яслях-садку №8 градуснікаў не было ні ў спартыўнай зале, ні ў медыцынскім кабінеце. Як высветлілася, там тэмпература не адпавядала нарматыву…

У садку №9 у спальні малодшай групы № 1, дзе знаходзіліся дзеці ва ўзросце да 3 гадоў, градуснік паказваў +16 градусаў.

І ў садку №19 было, мякка кажучы, халаднавата: усяго +14. Загадчыца толькі разводзіла рукамі. Маўляў, у будынак ацяпленне падаецца цэнтралізавана з кацельні. Дык што мы можам зрабіць?

Няўтульна было і ў іншых праверачных дзіцячых садках.

— Мы вынеслі прадпісанні начальнікам аддзелаў адукацыі, спорту і турызму адміністрацый Першамайскага і Чыгуначнага раёнаў Віцебска. Адказныя асобы павінны зрабіць так, каб тэмпература адпавядала норме. Мы, у сваю чаргу, пракантралюем, як зроблена «праца над памылкамі», — пракаментавала вынік маніторынгу **старшы памочнік пракурора Віцебска, малодшы саветнік юстыцыі Вольга КАРАЛЁВА.**

Пасля рэйду пайшоў па сына ў школу. У кабінеце, дзе дзеці застаюцца пасля ўрокаў, градуснік паказваў +16. Педагог сказала, што начальства ў курсе, але…

Калі задумацца, з-за таго, што дзеці хварэюць, бацькі бяруць бальнічны, і ім аплачваецца 100% сярэдняга заробку. Ці выгадна гэта краіне? Не! Дык можа танней адрэгуляваць сістэмы падачы цяпла і эканоміць на выплатах?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Колькі б воўк ні валок…

# ЗЛАЧЫНЦУ ЗАТРЫМАЛІ ПРАЗ 17 ГАДОЎ

**Падчас сумеснай аперацыі супрацоўнікаў крымінальнага вышуку міністэрстваў унутраных спраў Беларусі і Расіі на тэрыторыі апошняй быў затрыманы грамадзянін нашай краіны, які хаваўся ад правасуддзя 17 гадоў.**

Вышук мужчыны вёўся з кастрычніка 1997 года, калі ён сумесна з хаўруснікам у жылым доме ў Мінску з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі ўчыніў забойства аднаго чалавека і зрабіў замах на жыццё другога, паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў Канстанцін Шалькевіч.

Першапачаткова падазраваны хаваўся ад беларускага правасуддзя пад чужым імем у Расіі, выкарыстоўваючы падроблены пашпарт грамадзяніна гэтай дзяржавы. У 1999 годзе на тэрыторыі Калінінградскай вобласці ў складзе групы ён выкраў чалавека. Сваю ахвяру злачынцы вывезлі ў багажніку аўтамабіля ў іншы горад, доўгі час трымалі прыкаванай наручнікамі да батарэі цэнтральнага ацяплення, збівалі, патрабуючы буйную суму грошай. Пасля гэтага грамадзянін уцёк у Літву і быў абвешчаны ў міжнародны вышук. Мужчына ўсяляк змяняў сваю знешнасць, маскіраваўся, называў сябе выдуманымі імёнамі і прозвішчамі. Тым не менш сумесныя намаганні супрацоўнікаў крымінальнага вышуку Беларусі разам з праваахоўнымі органамі іншых краін і найперш Расіі далі свой плён. Грамадзянін быў затрыманы ў Пскове на кватэры аднаго са сваіх знаёмых. Цяпер органы пракуратуры Расійскай Федэрацыі вырашаюць пытанне аб меры абмежавання яго свабоды, абмяркоўваецца магчымасць экстрадыцыі ў Беларусь.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Ну і ну!

# У БАБРУЙСКУ БАЧЫЛІ ІЛЖЭСВЯТАРА

**Пра Юрыя Крата, які выдае сябе за кліріка Грузінскай царквы і перыядычна гастралюе па Беларусі, упершыню загаварылі некалькі гадоў таму. Дзіўнаваты чалавек апранаецца ў адзенне святара ці наогул епіскапа.**

Занепакоенае такім нахабствам духавенства папярэджвае людзей, каб не трапляў у яго пастку. Бо самазванец не толькі апранаецца па-царкоўнаму, але яшчэ збірае ахвяраванні і праводзіць платныя трэбы (дакладней, бярэ авансы за іх і знікае). Нядаўна на сайце Бабруйскай епархіі з'явілася інфармацыя пра тое, што гэты чалавек рэгулярна заяўляе аб сабе на тэрыторыі Глускага раёна. Юрыст епархіі Ігар Хадасевіч пацвердзіў, што адзін з прыхаджан расказаў гісторыю, як ілжэсвятар скарыстаўся паслугамі мясцовага таксіста. Маўляў, ён быў апранутым у адпаведную вопратку і прасіў павазіць яго па навакольлі для збору ахвяраванняў. Незвычайны пасажыр накатаў вялікую суму грошай, а падчас адной з адлучак раптоўна знік.

Наколькі гэта гісторыя адпавядае рэчаіснасці, удакладніць не атрымалася. Прынамсі ў бабруйскую міліцыю пацярпелыя ад гіпатэтычнага махляра не звярталіся. У Следчым камітэце Магілёўскай вобласці таксама ніякіх спраў наконт чалавека ў расе, які падманным шляхам збірае грошы, не разглядалі. Але, удакладніў, чуткі пра яго сапраўды ходзяць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# НАШКОДЗІЎ? АДКАЖАШ!

**Пра тое, што на тэрыторыі Магілёўскага раёна праводзілася незаконнае паляванне, па тэлефоне даверу Дзяржінспекцыі паведамілі відавочцы. Высветліць, хто да яго мае дачыненне, дапамога генатыпічная экспертыза: адзін з парушальнікаў згубіў на месцы здарэння пальчатку. Апроч таго, на снезе засталіся сляды абутку, машын і снегаходаў.**

Выкрыць іншага браканьера, які працаваў егерам у Чавускім раёне, атрымалася дзякуючы інспектарскай кемлівасці. Пагутарыўшы з прадстаўніком карыстальніка паляўнічых угоддзяў, супрацоўнікі Магілёўскай міжрайінспекцыі заўважылі неадпаведнасці ў тлумачэннях, а пазней знайшлі і рэчавыя доказы: мяса і рэшткі «няўлічанага» аленя егер хаваў у сябе на падворку.

Яшчэ чацвярых нелегалаў, якія незаконна здабылі дзіка, дзяржінспектары затрымалі пад Лельчыцамі падчас сумеснага рэйду з супрацоўнікамі ДАІ. Маладыя людзі мелі пры сабе капканы і незарэгістраваную стрэльбу. Іх чакае суд.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАПРЫЗЫ ПРЫРОДЫ СВЯТА НЕ САПСУЮЦЬ!

**«Залатыя» подзвігі ўкраінак, заканамерны подыум тытулаванай прадстаўніцы Казахстана і нестабільнае выступленне нашых юніёраў**




Фота БЕЛТА.

**На юніёрскім чэмпіянаце свету па біятлоне нашы паўднёвыя суседзі выступаюць вельмі ўдала. У чарговы дзень спаборніцтваў скарбонка зборнай Украіны папоўнілася яшчэ адным «золатам». Ужо другую індывідуальную гонку ў дзяўчат выйграе ўкраінка — у гэты раз спартыўны лёс усміхнуўся 21-гадовай ураджэнцы Сум Юліі Журавок.**

На прэс-канферэнцыі дзяўчына літаральна свяцілася ад шчасця.

— Ушчыпніце мяне хто-небудзь, — з адкрытай усмешкай казала Юлія. — Дагэтуль не верыцца, што гэта не сон. Індывідуальная гонка — мой канёк. Нядаўна ў гэтай дысцыпліне я заняла трэцяе месца на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы, але гэта была не лепшая мая гонка. Спатрэбіўся час, каб зразумець, што не атрымалася тады, каб не паўтарыць тое ж самае ў Мінску. Шчыра кажучы, не думала, што траплю нават у шасцёрку лепшых, бо на чэмпіянаце свету вельмі сур'ёзная канкурэнцыя.

А вось бронзавы прызёр «індывідуалкі» Галіна Вішнеўская з Казахстана, наадварот, ужо прызвычаілася да медальных сюрпрызаў. Дзяўчына пяты год запар здабывае ўзнагароды на топавых юніёрскіх спаборніцтвах. Летась, напрыклад, станавілася чэмпіёнкай свету ў гонцы пераследавання, а на зімовых юнацкіх Алімпійскіх гульнях 2012-га двойчы ўзнімалася на п'едэстал. Між іншым, для 21-гадовай ураджэнкі Сяміпалацінска гэта апошні юніёрскі сезон.

— Пераход у «сеньёры», напэўна, не бывае лёгкім. Гэта сапраўды складаны працэс. Мне пашанцавала з трэнерам (Рафаіль Мірсалімаў. — **Аўт.**), які мяне вельмі падтрымлівае, калі мне нешта не ўдаецца на дарослых спаборніцтвах. На жаль, ён не змог прыехаць у Мінск з-за праблем з сэрцам. Спадзяюся, мой медаль дапаможа яму хутчэй папраўіцца.

Што датычыцца выступленняў беларусак, то лепшай з нашых дзяўчат стала Настасся Кунец, якая з дзвюма хвілінамі штрафу фінішавала на 21-м месцы. Астатнія беларускі ў выніковым пратаколе размясціліся за межамі трыццаткі.

Дарэчы, не самае «ветлівае» надвор'е — мокры, ліпкі снег і шэрыя, цяжкія хмары — не спалохалі сапраўдных аматараў біятлону. Кампактныя трыбуны «Раўбічаў» былі амаль што цалкам запоўнены. Сярод гледачоў асабліва шмат было дзяцей, якія ў перапынках паміж гонкамі атакавалі снежныя насыпы, руплівa створаныя дворнікамі. Чым не пляцоўка для гульні ў снежкі?

А вось біятланісты не звярталі ўвагу на капрызы прыроды, адзначаючы, што траса была «рабочай». Ды і вецер асаблівых праблем спартсменам не прынёсіў. У юніёраў, між іншым, даволі шмат біятланістаў адстраляліся «на нуль». Тры прызавыя месцы якраз занялі выдатныя стральбы — француз Арыстыд Бег, расіянін Аляксандр Дзядзюхін і нарвежац Вемунд Гурыгард.

Беларускія паклоннікі біятлона асабліва ўважліва сачылі за выступленнем Віктара Крыўко і Максіма Вараб'я, якія мелі найбольшыя шанцы на подыум. Але з-за двух промахаў на агнявых рубяжах хлопцы змаглі прэтэндаваць толькі на месца ў дзясятцы: Крыўко фінішаваў шостым, Варабей — восьмым.

Пакуль гэта лепшыя выступленні беларускіх юніёраў на чэмпіянаце. Чакаем вынікаў спрынтарскіх гонак.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

# «ЯК НАСТРОІЦЬ ІНТЭРНЭТ?»

**Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, якія бытавыя пытанні найбольш хвалююць удзельнікаў чэмпіянату**

**Каб праблемы не адцягвалі ўвагу спартсменаў ад гонак, на дапамогу біятланістам прыходзяць валанцёры. Дзясяткі хлопцаў і дзяўчат у пазнавальных чырвоных куртках працуюць у «Раўбічах» не першы дзень і ўжо сталі хадзячай даведкай для замежнікаў. Аб асаблівасцях працы валанцёраў, просьбах, з якімі да іх найчасцей звяртаюцца госці чэмпіянату, нашаму карэспандэнту падрабязна распавёў будучы перакладчык Сяргей МАЛАШЭНКАЎ, студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

— Прыкладна за месяц да пачатку першынства свету я адправіў заяўку арганізатарам, і мяне прынялі, — узгадвае хлопец, з якім мы сустрэліся ў фае другой раўбіцкай гасцініцы. — З намі праводзілі заняткі, тлумачылі спецыфіку спаборніцтваў, прасілі, каб безумоўна, былі ветлівымі і ўсміхаліся, пашырылі свой спартыўны лексікон…

***— Давялося пакапацца ў слоўніках?***

— Па вялікім рахунку, я ведаю шмат, меў досвед працы валанцёрам. Летась працаваў на першынстве свету па хакеі, але ўсё роўна былі пэўныя моманты, якія трэба было падвучыць. Ад нас найперш патрабуюць добрага ведання англійскай мовы. І праблем з гэтым не ўзнікае, бо амаль усе ўдзельнікі чэмпіянату ведаюць англійскую.

***— Сяргей, а з якіх вышэйшых навучальных устаноў тут працуюць валанцёры?***

— Сярод тых, каго я ведаю, пераважаюць студэнты БДУ і Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Хаця ёсць яшчэ навучэнцы з Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, якія на гэтым першынстве задзейнічаны ў антыдопінгавай сістэме.

***— Працуеце з самага ранку?***

— У «Раўбічах» нам неабходна быць а 8 гадзіне раніцы, а вяртаемся ў Мінск вечарам з апошнім аўтобусам. Мы не замацаваны за нейкай зборнай, а імкнёмся дапамагчы тым, у каго ўзнікаюць нейкія патрэбы. А пытанні ў спартсменаў бываюць насамрэч розныя. Іх шмат. Напачатку многія гублялі багаж, але гэтую праблему хутка атрымалася вырашыць. Многія цікавіліся, у якім памяшканні трэба захоўваць зброю і лыжы, як прайсці на арэну, дзе ўзяць сродкі асабістай гігіены. Але самае папулярнае пытанне тычыцца настройкі інтэрнэту і карыстання карткай Wi-Fi.

***— А з беларускімі грашамі праблемы не ўзнікалі?***

— Толькі напачатку. У многіх банкаматах, устаноўленых на тэрыторыі спартыўнага комплексу, амаль не было еўра. Былі пераважна долары. Але і з гэтай праблемай паспяхова справіліся.

***— А хто са спартсменаў аказаўся самым пераборлівым?***

— Больш за ўсё пытанняў задаюць нарвежцы, немцы, аўстрыйцы, бо іх вельмі шмат і ім часта патрэбна дапамога. На адпачынак і звычайныя размовы з намі ў іх не так шмат часу, а таму пытаюцца выключна пра надзённае. Пытанні, якія б выходзілі за межы спаборніцтваў, пакуль чуць не даводзілася. Замежнікі звяртаюцца да нас даволі часта. І калі адсутнічаць у гасцініцы хвілін 20, у фае цябе абавязкова ўжо нехта будзе чакаць. Валанцёры павінны прысутнічаць тут пастаянна.

***— Табе падабаецца працаваць менавіта са спартсменамі?***

— Так, яны ўсе мае аднагодкі, з імі лёгка кантактаваць і яны ўсе дружалюбныя. Калі да іх звярнуцца, яны заўжды падтрымаюць з табой размову. І не трэба забываць пра тое, што для мяне гэта выдатная магчымасць папрактыкавацца з носьбітамі мовы. Ва ўніверсітэце, дарэчы, пайшлі насустрач, і ніякіх перашкод, нягледзячы на тое, што чэмпіянат праводзіцца ў час заняткаў, нам не чынілі. Аднак мы ўсё даведваемся пра хатнія заданні і выконваем іх пасля працы ў «Раўбічах», каб не адставаць у вучобе ад астатніх студэнтаў.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Фота Надзеі БУЖАН.

# «У «Раўбічах» усё на высокім узроўні»

**Камфортныя ўмовы, класнае надвор'е і выдатны стадыён. Карэспандэнт «Звязды» назапасіўся ўражаннямі ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату:**

**Аліна СЛЯПЕНКА (Казахстан):**

— Я ўпершыню ў жыцці прыехала ў Беларусь. Разам з камандай пераважна трэніруюся ў Еўропе, але сёлета былі ў Цюмені, Эстоніі, а пасля прыехалі сюды і ўбачылі такі комплекс! На стадыёне ў «Раўбічах» усё зроблена на высокім узроўні. Гэта тычыцца і стрэльбішча, і ўсёй трасы, і канкрэтна пад'ёмаў. Нам спадабалася ў тым ліку і яркая цырымонія адкрыцця спаборніцтваў. Так, мы таксама не ўтрымаліся і разам з усімі пачалі танцаваць. Варта дадаць, для нас, спартсменаў, падрыхтавалі прыемныя і памятныя падарункі. Што тычыцца нашых задач, федэрацыя настройвала нас на барацьбу за ўзнагароды, каб у выніку прабегчы лепей, чым можам. Як з біятлонам у нашай краіне? У яго таксама ўкладваюць грошы. Наш спорт паступова развіваецца і не стаіць на месцы.

**Крысціна РАЗЦОВА (Расія):**

— Бегла па трасе добра. Надвор'е — проста клас! Са стральбой, безумоўна, крыху не атрымалася, але ўсё яшчэ наперадзе. Для мяне ваша траса добра знаёмая. Калі займалася лыжнымі гонкамі, шмат трэніравалася ў Раўбічах. Я вельмі люблю гэта месца, і мне ўсё падабаецца. Дарэчы, была тут яшчэ тады, калі нічога не было ўзведзена. Стаяў адзін будынак. І таму я вельмі задаволеная тым, што тут зроблена для біятлона.

***— Твая мама Анфіса ўчора была на трыбунах. Гэта дадатковая адказнасць для цябе?***

— Не, у мяне наогул, калі я яе ўбачыла, узняўся настрой. Я літаральна падскочыла! Мне захацелася адразу бегчы, страляць. Не ведаю, ці засмуцілася яна, ці ўзрадавалася маім вынікам (я заняла 13-е месца). Для мяне гэта, між іншым, першы старт на першынстве свету, і я ад выніку не засмуцілася.

**Ондржэй САНТОРА (Чэхія):**

— Самы вялікі стадыён у Чэхіі знаходзіцца ў горадзе Стара-Месца-на-Мараве, дзе праходзіў чэмпіянат свету. Ён на парадак большы, чым гэты, аднак у «Раўбічах» мне таксама падабаецца траса і арэна. Усё падрыхтавана на добрым узроўні. Было шмат балельшчыкаў, што незвычайна для юніёрскіх спаборніцтваў. Мне гэта падабаецца.



Фота Надзеі БУЖАН.

Катрына Эген падтрымлівае свайго сына.

**Катрына ЭГЕН (балельшчыца):**

— Ведаеце, гэта фантастычная магчымасць — быць на чэмпіянаце свету і сачыць за спаборніцтвамі. Мы прыехалі сюды з мужам і іншымі бацькамі, каб падтрымаць сваіх дзяцей, якія выступаюць за зборную. Учора наш Андрэас апынуўся на 5-м радку. Я ніколі яшчэ не наведвала падобныя старты, і для мяне тут усё цікава.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# НА ЛЫЖАХ ДА КРЭПАСЦІ

**У Магілёў завіталі ўдзельнікі лыжнага пераходу ад Масквы да Брэста**

**У асноўным гэта падлеткі 15–17 гадоў, выхаванцы Ніжагародскай кадэцкай школы-інтэрната імя В. Маргелава, Горскага кадэцкага корпуса з Інгушэціі, ваеннапатрыятычных клубаў Расіі. Свой прабег яны прысвяцілі 70-годдзю Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкай Германіяй і 85-годдзю паветрана-дэсантных войскаў. На працягу двух дзён яны знаёміліся з горадам, наведвалі месцы былых баёў, выступілі з канцэртам для навучэнцаў Магілёўскага абласнога кадэцкага вучылішча.**

— У патрыятычна-выхаваўчым плане такія сустрэчы шмат чаго даюць, — адзначыў **галоўны спецыяліст упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый ЛАЦЯНКОЎ.** — Хлопцы і дзяўчаты ўшанавалі памяць загінулых салдат Вялікай Айчыннай, пабывалі на месцах воінскіх пахаванняў сваіх землякоў, прасякнуліся тым духам, які ўсіх нас аб'ядноўвае. Тым больш што дзяцінства знакамітага дэсантніка Васіля Маргелава, імя якога носіць Ніжагародская кадэцкая школа-інтэрнат, прайшло ў Касцюковіцкім раёне. На Магілёўшчыне гэты паход наогул пабываў упершыню, хоць яны ажыццяўляюцца расіянамі з 1994 года. За гэты перыяд яны толькі тройчы праходзілі праз Беларусь, і тое па іншых абласцях.

Дарэчы, за дзень юныя лыжнікі праходзяць па 25–30 кіламетраў. Пакуль праблем са снегам у іх не ўзнікала. З Магілёва яны таксама пайшлі на лыжах. Некалькі магілёўскіх кадэтаў разам з імі прайшлі невялікі ўчастак у напрамку Бабруйска. Пасля перапынку ў горадзе на Бярэзіне расіяне возьмуць напрамак на Брэст. Фініш адбудзецца 23 лютага.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Будзь у курсе!

# АЎТОБУСЫ ПОЙДУЦЬ ПА «ЛЕТНІМ» РАСКЛАДЗЕ

**У сувязі з тым, што краіны Еўропы пераходзяць на «летні час», дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» з 29 сакавіка будзе выконваць рэгулярныя рэйсы туды таксама па «летнім» раскладзе руху.**

Напрыклад, па маршруце Мінск — Беласток адпраўленнем з Мінска ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 23.30 па чацвяргах, пятніцах і суботах, з Беластока — у 16.00 (замест 15.00) па пятніцах, суботах і нядзелях. Рэйсы Мінск — Варшава будуць выконвацца ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 18.30 (замест 19.30) штодзённа, а з Варшавы — у 16.30 таксама штодзённа. Аўтобус Мінск — Друскінінкай адпраўляецца ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 6.50 па суботах, з Друскінінкая — у 17.00 (замест 16.00) зноў жа па суботах. Рэйс да Кіева адпраўляецца ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 22.20 (замест 23.20), ад аўтавакзала «Усходні» ў 22.45 (замест 23.45) па серадах, чацвяргах і пятніцах. З Кіева можна будзе выехаць у 13.15 па чацвяргах, пятніцах і суботах.

Змяненні ў сувязі з пераходам на «летні» расклад датычацца і іншых маршрутаў, таму пасажырам перад паездкай варта яшчэ раз зазірнуць у яго.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

**Дзмітрый БАЧКОЎ:**

# «ЗАБАЎЛЯЛЬНЫ СКЛАДНІК У НАВІНАХ — УЖО ДАЎНО НЕ АДКРЫЦЦЁ»

**У журналістыцы ён не навічок: яшчэ са студэнцкіх гадоў спрабаваў сябе ў газетах, на радыё, аднак, трапіўшы на тэлебачанне, зразумеў дакладна, што знайшоў сваё месца пад сонцам. Але папулярнасць прыйшла толькі гады два таму, калі пачаў весці грамадска-палітычнае ток-шоу «Форум» і выніковую інфармацыйную праграму «Галоўны эфір» на «Беларусь 1». Да гэтага была праца ў «Панараме», а яшчэ раней праграма «Справы сямейныя», якая некалі выходзіла на «ЛАДзе» (цяпер «Беларусь 2»). Дзмітрый Бачкоў не баіцца агучваць важныя і актуальныя пытанні, звяртаючыся да чыноўнікаў, заўсёды гатовы адважыцца на любую авантуру дзеля добрага сюжэта, але разам з тым у прыярытэце для яго заўсёды сям'я. Спрабуем высветліць, ці лёгка быць кожны тыдзень у эпіцэнтры «перастрэлак» экспертаў, як здабываць самыя высокія рэйтынгі і якія правілы дазваляюць жыць з асалодай.**



## НЕЙТРАЛЬНАСЦЬ НЕ ВЫКЛЮЧАЕ ЭМОЦЫЙ

***— Падчас адкрытага дыялогу з Прэзідэнтам вы казалі пра тое, што сёння адчуваецца неабходнасць зменаў у жыцці краіны і грамадства. На ваш погляд, у якіх сферах гэта найбольш патрабуецца?***

— Я агучваў гэта ў сваім пытанні не проста таму, што размаўляў з многімі чыноўнікамі і экспертамі на сваіх праграмах, а ў першую чаргу праз тое, што змены ўжо адбываюцца. І мне хацелася ведаць, у якім рэчышчы бачыць іх лідар нашай краіны. Наогул, перамены ў сучасных умовах — паняцце перманентнае. Змены — неад'емная з'ява рэчаіснасці, бо час мяняецца і ўмовы на рынку ўжо зусім іншыя... Узяць тое ж будаўніцтва жылля: ускалыхнулі — і многія пытанні, якія гадамі прымушалі людзей чакаць свайго часу, сталі вырашацца. Сістэма жыллёва-камунальных паслуг год-два таму была тэмай, якой не абураўся хіба што лянівы... Нядаўна гутарыў з мэрам Мінска Сяргеем Шорцам і ведаю, што і тут чакаюцца пераўтварэнні, каб наша сталіца набыла твар больш сучаснага еўрапейскага горада. Разам з тым у размове пра змены не абмінуць увагай і СМІ, бо менавіта яны адлюстроўваюць усё тое, што ў нас і з намі адбываецца. Мы аднолькава звяртаем увагу на хібы ў розных сферах, і ніхто не можа нас папракнуць, быццам не выкрываем праблемы і недахопы, якія існуюць зараз і патрабуюць выпраўлення. Таму што мы не проста СМІ, а мы жыхары гэтай краіны і нам не ўсё роўна.

***— Ток-шоу «Форум» — гэта праграма меркаванняў па найбольш злабадзённых і актуальных праблемах, падзеях і пытаннях, дзе вы выступаеце ў якасці мадэратара. Ці ўдаецца вам прытрымлівацца «нейтралітэту»?***

— Імкнуся быць максімальна аб'ектыўным, наколькі дазваляе тэма і сітуацыя. Здараецца так, што на пэўным этапе абмеркавання не ўдаецца захаваць парытэт меркаванняў, каб усе бакі былі прадстаўлены. Альбо размова ідзе, але я разумею, што ніхто не агучвае тых думак, якія чуеш на вуліцы, сустракаеш у СМІ. Тады я іх агучваю: маўляў, а ёсць жа ў праблемы яшчэ і такі бок. Бываюць выпадкі, калі настолькі захапляешся абмеркаваннем, што недзе выказваеш і свой пункт гледжання. Стараюся гэта рабіць вельмі рэдка, бо ў праграме вядучы ведае, дзе і што лепш сказаць, а гэта не зусім сумленна ў адносінах да прысутных. Хаця з пазіцыі стварэння тэлевізійнай праграмы больш выйгрышна, калі вядучы не толькі кіруе працэсам, але і сам з'яўляецца актыўным удзельнікам. Я, калі агучваю сваё меркаванне, то заўсёды чакаю: можа, нехта будзе са мной не згодны альбо наадварот падтрымае і працягне тэму. І наогул, мне здаецца, пазіцыя, калі выказваеш свой пункт гледжання, больш шчырая ў дачыненні да ўдзельнікаў праграмы і да нашых тэлегледачоў.

***— Ці даводзіцца стрымліваць гасцей праграмы, калі ў запале ўдзельнікі дыскусіі губляюць кантроль над эмоцыямі?***

— Рознасць меркаванняў і ёсць наша мэта. «Форум» — пляцоўка, дзе мы імкнёмся гаварыць пра самае важнае і актуальнае, набалелае. Калі абмеркаванне даходзіць да кропкі кіпення, то не варта гэта згладжваць. Мне як мадэратару важна знайсці такі накірунак для дыялогу, каб людзі з рознымі поглядамі пачулі адно аднаго. Нават калі яны не знойдуць паміж сабой паразумення, то даведаюцца пра чыюсьці пазіцыю, акрамя сваёй... Неяк на інтэрв'ю з Раманам Продзі, былым прэм'ер-міністрам Італіі, пачуў ад яго: «Лепш няхай людзі страляюць словамі, чым кулямі». Ён гаварыў гэта пра сітуацыю ва Украіне, і я разумею, што не зусім раўназначна параўноўваць, але лепш няхай ідзе абмен меркаваннямі, аргументамі і папрокамі, аднак будзе спроба зразумець адзін аднаго і не ісці з нявырашанымі праблемамі далей. Хаця мы не займаемся канкрэтна пошукам рашэння праблемы. Самае важнае для нас — здабыць максімальную колькасць меркаванняў экспертаў, пазіцый з розных бакоў. Калі часам нельга гаварыць без павышэння голасу, то чаму б і не. Так, напрыклад, у ток-шоу пра Афганістан я, можа, і павінен быў супакойваць герояў, які некалі пакінуў сваю Радзіму, страціўшы родных, але не стаў нічога рабіць, бо ў той момант у чалавека душа крычала. І ён меў права выказацца. Зразумела, калі людзі неадэкватна сябе паводзяць, то звяртаем на гэта ўвагу і нагадваем пра павагу да іншых удзельнікаў дыскусіі.

***— Вы неяк адзначалі, што запіс «Форума» патрабуе вялікай аддачы. Як аднаўляеце сілы пасля цяжкага дня?***

